Весці БДПУ. Серыя 1. 2017. № 2. С. 123–127.

УДК 821.161.3 М. Стральцоў

# МАРАЛЬНА-ЭТЫЧНЫЯ ПОШУКІ ГЕРОЯЎ ПРОЗЫ МІХАСЯ СТРАЛЬЦОВА

**Д. І. Бурко,**
*аспірант кафедры беларускай літаратуры і культуры БДПУ*

Паступіў у рэдакцыю 17.03.17.

UDC 821.161.3 М. Стральцоў

# MORAL AND ETHICAL SEARCH BY THE CHARACTERS IN THE PROSE OF MIKHAS STRALTSOU

**Dz. Burko,**
*Postgraduate Student of the Department of Belarusian Literature and Culture, BSPU*

Received on 17.03.17.

У артыкуле разглядаецца праблема пошуку чалавекам свайго месца ў грамадстве. Закранаюцца пытанні экзістэнцыяльных перажыванняў героя, заклапочанага думкамі аб малой радзіме, бацькоўскім доме, сваім выбары паміж вёскай і горадам. Глыбокія ўнутраныя перажыванні лірычнага персанажа пададзены аўтарам на фоне бытавой паўсядзённай неўладкаванасці.

*Ключавыя словы:* лірычная проза, лірычны герой, мікрападзеі, экзістэнцыяльны кампанент, экзістэнцыяльная мяжа.

The article examines the problems related to a human's search for their place in society. The author describes the existential feelings of the main character, who is preoccupied with the thoughts of his "little homeland", his parents' house, his choice between the village and the city. The deep inner feelings of the main character are presented by the author against the backdrop of day-to-day hardship he faces.

*Keywords:* fictional prose, fictional character, micro-events, existential component, existential boundaries.

Пісьменніцкі талент М. Стральцова шматгранны, глыбокі, у нечым самабытны. Літаратуразнаўца П. Васючэнка пра М. Стральцова піша: «Рознаскіраванасць яго мастацкай асобы дапаўнялася цэласнасцю і самабытнасцю таленту, для якога характэрныя асаблівая назіральнасць, імпрэсіяністычнасць успрыняцця, эмацыянальная чуйнасць, увага да нюансаў прыроднага і чалавечага быцця» [1, с. 404]. Проза пісьменніка адметная тонкім лірызмам, пачуццёвасцю, інтэлектуальнай і стылёвай далікатнасцю. Прыроджаны арыстакратызм і шляхетнасць М. Стральцова пралягае праз усю яго творчую спадчыну. Паэт Рыгор Барадулін пісаў пра М. Стральцова: «Вырай беларускіх паэтаў і празаікаў пачатку 60-х гг. быў шчаслівы тым, што ў ім з першага прылёту быў Міхась Стральцоў, які меў прыроджаны абсалютны літаратурны густ» [1, с. 404].

Творчы шлях М. Стральцова-празаіка на ніве беларускай літаратуры пачынаеца апавяданнем «Блакітны вецер». Гэтым творам малады празаік адкрыў сабе дзверы на пісьменніцкі Парнас. Першае апавяданне (да нашага часу яно з'яўляецца аб'ектам увагі крытыкаў) засведчыла, што М. Стральцоў, па сутнасці, абмінуў стадыю вучнёўства, стадыю літаратурнага саспявання. Можна сабе ўявіць, колькі душэўных перажыванняў, роздумаў і высілкаў, унутраных дыялогаў правёў пісьменнік у адзіноце перад тым, як узяцца за пяро і пакінуць адметны след у беларускай літаратуры. П. Васючэнка сцвярджае, што першае апавяданне М. Стральцова «Блакітны вецер» вельмі важнае, у ім бачна, што пісьменнік сфарміраваўся, у яго дакладна прасочваецца ўласны, адрозны ад іншых стыль: «У апавяданні «Блакітны вецер» зліліся прыкметы, якія надалей будуць пазначаць «уласна стральцоўскае». Адна з найпершых: неадменны лірызм, які забяспечваецца прысутнасцю лірычнага героя, надзеленага адвечнай рэфлексіяй, пачуццёвым максімалізмам…» [1, с. 405].

Лагацкі, лірычны герой апавядання «Блакітны вецер», – чалавек адзінокі, без адчування свайго канкрэтнага месца ў грамадстве, сярод людзей, ён унутрана неўладкаваны. Апавяданне пачынаецца з таго, што Лагацкі прачынаецца ноччу і не можа заснуць ад думак, якія вiруюць у галаве. Герой вядзе ўнутраны дыялог з самім сабой адносна таго, чаму не пайшоў на праводзіны ў войска суседа Толіка, які асабіста клікаў яго: «Лагацкі рэфлексуе з нязначнай ва ўсіх адносінах нагоды: нехта па суседству па імені Толік, па прафесіі токар, запрасіў яго на праводзіны ў войска, а ён не пайшоў. Герой трывожыцца з-за таго, што падумаюць і скажуць аб ім, а па сутнасці, перажывае ўласную неўладкаванасць, дыскамфортнасць у зададзеных, агульнапрынятых варунках быцця» [1, с. 406]. Лагацкі жыве ў двух светах. Свеце ўнутраных перажыванняў, фантазій, мар і свеце людзей, якія ўвесь час побач, пра

што сведчаць смех і галасы, што даносяцца з калідора праз сцены ў кватэру да Лагацкага: «У пакоі ціха. Ноч. Дзве гадзіны ночы – Лагацкі гэта ведае. Зараз вось пройдуць, калі не прайшлі, з фабрыкі работніцы: яны заўсёды праходзяць у гэты час, і так ясна чуваць тады ўночы крокі. І яшчэ гамонку» [2, с. 173].

Кантакт з людзьмі не заўсёды вербальны, не заўсёды павінна адбыцца фізічнае судакрананне, каб быў дыялог, абмен інфармацыяй, пачуццямі. Часам гэты кантакт з вонкавым светам, рэальным светам жывых людзей адбываецца праз рэчы, сімвалы, што нагадваюць лірычнаму герою пра існаванне побач з ім другіх людзей, прымушаюць вярнуцца з далёкіх краёў успамінаў і мрояў, дзе блукае «Блакітны вецер»: «Адразу ж абступіў яго пах фарбы, халоднай тынкоўкі і пылу – заўсёдны пах пад’ездаў, скупа падпраўлены цёплым духам чалавечага жытла. Расціснутыя абцасамі, на пляцоўцы валяліся недакуркі. Лагацкі ўспомніў: учора ў суседняй кватэры спраўлялі праводзіны» [2, с. 174].

Значных эпічных падзей у творы няма. Асноўная лінія – унутраны пошук героем свайго месца ў грамадстве. П. Васючэнка піша: «Значныя драматычныя або эпічныя падзеі ў творы адсутнічаюць – вакуум запаўняецца мікрападзеямі, экзістэнцыйныя ж падзеі выносяцца паза дужкі апавядання» [1, с. 406]. Што ж увогуле такое гэты «Блакітны вецер»? Нам думаецца, што гэта метафара. Ужыты пісьменнікам вобраз – нішто іншае, як спроба засяродзіцца ў сабе і знайсці месца ў грамадстве. Каб вярнуцца да людзей, трэба спачатку іх пакінуць: «Блакітны вецер прымроіўся Лагацкаму падчас яго блуканняў па горадзе, пры набліжэнні да “старога знаёмца”, ці то недабудаванага, ці то пакінутага ў руінах дома» [1, с. 406].

Вобраз дома паўстае ў творы як экзістэнцыяльная мяжа, як унутраны стан лірычнага героя апавядання: «Стары знаёмец без аблічча і нумара дом, – думаў Лагацкі, – і я расказаў бы табе, чым была для мяне гэтая незнарок падгледжаная наіўнасць. Ды ты не ведаеш, што такое пахі, водар маленства, не разумееш, чаму чарнільная пляма, выпадкова ўбачаная на снезе, можа хваляваць мацней, чым самае сталае дзіва» [2, с. 175]. Гэты вобраз звязваецца ў свядомасці лірычнага героя са сном, убачаным у дзяцінстве: «Ён ведаў: сапраўднае дзіва было ці простае, як гэта дзіцячая горка, ці наіўнае, як выцвелы паркаль. І сапраўды, вецер быў блакітны, як у сне. У ім было ўсё: трывожная смуга даляглядаў і незабыўнае святло маленства; дажджы густыя, як вецер, і пах суніц; шчымлівая радасць у сэрцы і непрыкрытае вясёлае здзіўленне перад светам» [2, с. 175]. Свет дзяцінства, вобраз прыемных, пяшчотных успамінаў будзе і далей пралягаць праз усю творчасць пісьменніка.

Унутраны свет кожнага чалавека глыбокі і шматгранны, адрозны ад іншых светаў, супярэчлівы ў сваім адзінстве. Кожны асобна ўзяты чалавек – гэта космас, які змяшчае безліч галактык – думак, мар, перажыванняў і памкненняў. Прага пазбавіцца адзіноты і заставацца глыбока адзінокім – наканаванне глыбінных людзей. Такім глыбокім, глыбінным шукальнікам чалавечага цяпла і паразумення быў Міхась Стральцоў. Анатоль Сідарэвіч піша: «Ну і я стаю. Ні сумкі, ні авоські ў руках», – так пра сябе сказаў Міхась Стральцоў у вершы «На аўтобуснай станцыі». «Дакладна сказаў, лепш не скажаш. Ёсць людзі з лёгкай летуценнай душою, у такіх рукі заўжды вольныя. Такім не вельмі трэба ўсе нашы матэрыяльныя даброты. Свет такіх людзей спрабуе лавіць у свае сеткі, але злавіць не можа» [3, с. 27]. Трапна і глыбока характарызуе лірычнага героя з апавядання М. Стральцова «Смаленне вепрука» верш, напісаны пісьменнікам у якасці эпіграфа да аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь»:

«Сон.
Сон.
Сон.
Ноччу, бязлюднай і цёмнай,
Іду па зямлі.
Вышэзны і лёгкі,
Пакалыхваюся ад тугі.
Галава прыгнута пад небам.
Я плачу.
Зоркі – слёзы мае.
Спяць гарады і вёскі,
Я над імі іду.
Высокі, пахілы і лёгкі,
Пакалыхваюся ад тугі.
Шукаю шэрую вёску,
Вёску сваю.
Баюся:
Вышэзны і лёгкі,
Не прысяду там на парог,
Як самалёт рэактыўны не сядзе
На травяністым аэрадроме...
Я плачу.
Зоркі – слёзы мае» [4, с. 328].

Пошукі героем свайго месца ў грамадстве тужлівым рэфрэнам гучаць у многіх апавяданнях М. Стральцова. Пісьменнік глыбока адчувае прыроду чалавека і праз апісанне прыроды вонкавай трапна перадае ўнутраны стан лірычнага героя, блізкага па духу пісьменніку: «Ідуць ужо халады, бяруцца прымаразкі – ападаюць інеем сырыя туманы. Чарсцвее зямля, і цёмным ільсняна халодным зяленівам б’е ў вочы парадзелая пры дарозе трава. Ужо выпетрала зябліва, пасівела ў гародчыках і пазванчэла бадыллё, і панішчымнела паве-

тра» [2, с. 320]. Родныя вясковыя пейзажы ўзмацняюць эмацыйную ўнутраную тугу героя: «Неба ўдзень ужо ніжэй прыпадае, ціснецца да зямлі. Яшчэ выганяюць на пашу кароў – далей ад вёскі, у лес. Пад вечар жывёла не хоча вяртацца ў хлеў, цаляе адбіцца ў прапахлае бульбоўнікам і сцюдзёным капусным водарам поле. І вечарам і ўранку марозліва, хмельна, бы першаком, пахне ў наваколлі дымам» [4, с. 320]. Праз ілюмінацыйны стан прыроды, пераход ад цёплай восені да непазбежнага сну – зімы, М. Стральцоў перадае халодна-адзінокі засяроджаны стан свайго героя.

Лірычны персанаж апавядання Міхася Стральцова «Смаленне вепрука» жыве ў горадзе, але ў той старой яго часцы, што дужа нагадвае родную вёску: «Я жыў тады ў нечапанай часцы горада, калі надумаўся пісаць, у старым раёне, забудаваным няўклюднымі цаглянымі, а найбольш драўлянымі дамкамі, што ўсцяж патаналі ў садах» [2, с. 320]. У нядзелю, калі на вуліцы, дзе жыў лірычны герой, адбываўся кірмаш, усё яму нагадвала вёску, шчыміла ў душы, нібы клікала дамоў: «Увосень, кожнай раніцы ў нядзелю, чуваць было, як парыпваюць на маёй асфальтнай вуліцы вясковыя вазы, як цокаюць капытамі коні і як рохкаюць у драбінах падсвінкі» [2, с. 321]. Герою М. Стральцова падабаецца быць сярод тлуму вясковых людзей, слухаць іх гаману, назіраць за іх паводзінамі, быць часткай той хвалі, што на кароткі ранішні час нядзелі захлынула чужы пісьменніку горад. Як хораша і ёмка малюе М. Стральцоў акварэлькі з гаманкіх базарных вуліц: «Таўканіна, гармідар, і нетутэйшыя дзядзькі гукаюць нечага ад касы да цётак, што стаяць у чарзе і для большай пэўнасці штосьці на мігах паказваюць ім» [2, с. 321].

Лірычны герой заўважае і малапрыкметныя гарадскому воку паводзіны жывёлы, што ціха чакае сваіх гаспадароў каля вазоў з гасцінцамі і сціплым сялянскім дабром: «Конь, выпражаны з калёсаў, цягне сена з драбін, клыча яго ды матляе галавой, нібы: “так, браткі, так!” – хоча сказаць гаманкой кампаніі падпітых мужчын» [2, с. 321]. З непрыхаванай настальгіяй узгадвае герой апавядання гэтыя нядзельныя раніцы, гаманкія восеньскія кірмашы, гул пчалінага рою – не тутэйшых, не гарадскіх, але такіх родных М. Стральцову галасоў: «Вось так было, а можа, бывае і цяпер на тым гарадскім лапіку, дзе застаўся Конскі базар, вось так было тою парою, калі ідуць халады, калі бяруцца ўранку прымаразкі – ападаюць інеем старыя туманы. Тою парою, калі ў вёсках свяжуюць вепрукоў» [4, с. 321]. Лірычны герой М. Стральцова ў апавяданні «Смаленне вепрука» – вясковы хлапец, які фізічна жыве ў горадзе, але ментальна і духоўна знаходзіцца каля родных хат, у вёсцы, сярод сваіх.

Герой-вясковец вельмі блізкі па духу М. Стральцову. Пісьменнік прыехаў у горад шукаць сваё месца ў грамадстве. Будучы чулым і глыбокім чалавекам, ён усё навокал успрымае з павышанай чуллівасцю. Восень – час задуменнага асэнсавання свайго прызначэння, асаблівага засяроджання на пошуках свайго месца сярод людзей. У гэты час пісьменнік асабліва моцна адчувае сувязь з роднай зямлёй, каранямі, гэта бачна ў апісаннях прыроды, дэталёвых замалёўках пэўных момантаў, на якія звяртаеш увагу па пэўным часе, калі надыходзяць успаміны, звязаныя з тымі падзеямі, няхай і не значнымі, але вельмі блізкімі і салодкімі.

Адзін з найбольш важных момантаў для селяніна ў сельскагаспадарчым цыкле – гэта свежаванне вепрука. Пісьменнік засяроджваецца на ім, як на фундаментальным аспекце жыцця і смерці. Смерці дзеля прадаўжэння жыцця. Сваё месца ў грамадстве герой апавядання спрабуе знайсці сярод каменных вуліц вялікага горада, але ўсе яго думкі і генетычная сувязь шэрай восеньскай курадымнай смугой адлятаюць у далёкую вёску, дзе бацька героя свяжуе вепрука. На думку аўтара, «у апавяданні павінна была згадвацца тая пара і павінна была чуцца вёска: пах падмерзлых трэсак на дрывотні, тарахценне трактара ля фермы, і на шумавым фоне гэтым – гулкім ёкатам галасы людзей, спалоханы гэгат гусака на тарфянішчы, настылы звон калодзежнага вядра і нечакана – пругкі выпад ветру наўскасы, а над усім, ва ўсім павінна была быць каменная, зацятая маўклівасць зямлі, травы і схаладнелага, шурпата-шызага неба» [2, с. 321].

Нібы архаічны рытуал адбываецца на падворку людскога жытла, калі выходзіць гаспадар, каб закалоць кабана: «Трэба было каб, адчувалася, як выходзіць на ганак чалавек, як ляскае за ім, а пасля дробна брынчыць клямка; ён гэта чуе, але і наваколле пачынае ўжо валодаць ім. <…> Ён падманна, нібы нейкі другі знайшоўшы сабе клопат, прыпыніцца на ганку і твар падставіць ветру, і вочы яго трывожна будуць убіраць у сябе наваколле, і нябачна накрэсліць там яму гонкі вецер і сум палёў, і халодны вобмарак травы. І перадзімовае трыванне дрэў… Так ён будзе стаяць, і ў яго будуць варушыцца бровы. Ён пачуе, як зарохкае ў пуні вяпрук…» [2, с. 321–322].

М. Стральцоў паказвае эвалюцыю развіцця вобраза лірычнага героя ад дзіцячых гадоў да паўналетняга юнацтва, росквіту сіл. У персанажа М. Стральцова мы заўважаем рысы Сымонкі з паэмы Я. Коласа «Сымон-музыка». Проза пісьменніка пераклікаецца з паэзіяй Я. Коласа, зліваецца ў адну гарманічную

карціну-абраз чулай, глыбокай чалавечай натуры, якімі з'яўляюцца лірычны герой М. Стральцова і рамантычны персанаж Я. Коласа. «У дзяцінстве, у сваім вясквым дзяцінстве гэта быў надзвычай уражлівы хлапчук – хударлявы, бледны, шыракароты; парывісты, і адначасова ціхмяны, зацяты і ў той жа час быстры на слёзы. Можна сказаць, што душа ягоная ўбірала ў сябе многа…» [2, с. 323], – адзначае пісьменнік. У паэме Я. Коласа «Сымон-музыка» чытаем:

«Так, і праўда: непадобны
Быў Сымонка на другіх:
Гэта быў хлапчук асобны.
У яго вачах жывых
Думка нейкая бліскала
Утаропіцца, глядзіць,
І на губках смех бывала,
заблукае, задрыжыць» [5, с. 11].

Лірычны герой М. Стральцова вырастае, з раніма-чуллівага хлапчука ператвараецца ў статнага, поўнага сіл юнака, адкрытага будучыні, пакідае родную вёску і пераязджае ў чужы горад: «Расказаць трэба было пра юнака, які безразважна і смела рынуўся ў жыццё і не ашчаджаў сябе, шчыра беручы ад людзей і гэтак жа шчыра аддаючы ім сваё» [2, с. 324]. Бурапенныя ўрбаністычныя хвалі асвяжылі гарача-рамантычны пыл вясковага хлопца, прыўнеслі ў жыццёва-бытавы слоўнік дзецюка такія словы, як расчараванне, здрада, горыч, непаразуменне і пякучыя насмешкі: «І час надышоў, і пабурылася за спіною цішыня, і бяда пастукалася ў дзверы, і зазнаў ён тое, што хоць аднойчы ў жыцці зазнае кожны чалавек: і расчараванне, і адчай, і нудліва вінаваты позірк сяброў, і нетрывалую ласку жаночага сэрца» [2, с. 324].

І вось герой М. Стральцова, дзякуючы смутку і радасці, што давялося спазнаць у жыцці, пасталеў, сфарміраваўся, прызямліўся, прызвычаіўся, зжыўся з тымі, хто навокал, і зжыўся з сабой, са сваім унутраным светам, светам чулага хлопчыка, узнёслага юнака, светам разбітага і знявечанага шукальніка шчасця. Ён зрабіўся маўклівым, больш удумлівым і засяроджаным: «І вось сядзеў ён аднойчы ў добра знаёмага ў ягонай кватэры за на скорую руку, без жаночай помачы накрытым сталом. Гаварылі, маўчалі, бралі чарку і маўчалі зноў» [2, с. 324]. За сяброўскім сталом, у ціхія вечары і пры чалавеку, якому бяспрэчна давяраеш, можна дазволіць сабе такую раскошу, як пабыць сабой, тым сапраўдным, які калісьці трызніў пра шчасце. Загаварыць, выдыхнуць набалелае слова і замаўчаць зноў: «Ведаеш, быў я ў маці… Зіма. Сумнавата. Вечарам старая паставіць чыгунок з бульбай на камінак: сядзім з ёю, глядзім на агонь, гаворым ці маўчым – во як з табой… І хораша неяк, то бяздумна, то трывожна мне. Закуру крамную папяросу, а яна патухне зноў. І зноў я запалкай чырк ды чырк. А маці тады ціха так кажа мне: "Дык няможна так псаваць запалкі, сынок… Можа, ад вугольчыка прыкуры, га?" І, ведаеш, аж скаланула мяне ўсяго… Не тое каб сорамна стала перад ёй, – не запалак жа маіх шкадавала яна мне, – а падалося мне, браце… – Ён лёгка, усмешліва зыркнуў на субяседніка і, нібы збаяўшыся сваёй той расчуленасці, зарагатаў: – Што скажаш, га? А каб жа ты ведала, думаю, колькі мы, такія харошыя, тых запалак рублёвых па рэстарацыях ды піўных у адзін вечар кідаем, га?» [2, с. 324–325].

Чалавек расчуліўся і на хвілінку прыадкрыў завесу рэальнасці, але адразу ж спалохаўся, спахапіўся і павяртаў на сваё былое месца, месца блазна і гулякі. Пошукі свайго прызначэння ў грамадстве правялі лірычнага героя М. Стральцова па розных жыццёвых перапетыях і ператварылі з рамантычнай асобы, якая імкнулася да ідэалізацыі людзей, у скептыка, што згубіў веру, якому «душы прыўкрасныя парывы» замяніла рэстаранна-багемнае жыццё. Горад зжаваў чалавека сваімі бетоннымі сківіцамі, зламаў хрыбет, паабсякаў крылы, і выплюнуў на ўскраек жыцця, але пакінуў жыць.

Дзесьці на адзіноце, калі прырода гоіць збалелыя раны героя, прачынаецца ў нетрах душы басаногі хлапчына з глыбокімі сіня-шэрымі вачыма, які імкнецца вярнуцца ў родную вёску, у мінулае, дзе было так хораша, дзе была маладой маці, але час няўмольны. Як кравец адразае кавалкі кужалю, так і ён пераўтварае іх у памяць. Герой М. Стральцова знаходзіцца ў пастаянным пошуку свайго «я», ці то ў рэальным жыцці, ці то ў снах, трызненнях, калі вяртаецца дамоў і дакранаецца да мінулага: «О, навошта, такое знаёмае ўсё гэта, і навошта стаіць прад лавай маці, і навошта чыгуны каля яе ног, навошта яна павярнула галаву да яго, – о, які цёмны, невідушчы, цяжкі, нібы плёскат вады ў вядры, у яе пагляд! Ён хацеў ступіць да яе, але яна, засланяючыся, павяла рукой, і тады, нібы па хаценню яе, расхінуліся сцены, і трывожна, квола зашамацела, бліснула яму пад святлом ліхтара салома» [2, с. 326–327]. Сны, зрэшты як і ўсё ў жыцці, маюць ўласцівасць канчацца: «Так ён прачнуўся ўночы. А ўдзень яму прынеслі тэлеграму. Ва ўсіх нас ёсць ці была некалі маці, і, на жаль, не заўсёды добрыя прыходзяць да нас тэлеграмы» [2, с. 327] .

Пошук дарогі да сябе непазбежна звязаны са стратамі і расчараваннямі. Па зіме прыходзіць вясна, па вясне звонкімі як дзіцячы смех ручаямі спускаецца на зямлю лета. Нішто не вечна – надыходзіць восень. Сівыя, палыселыя, згорбленыя хлопчыкі і дзяўчынкі са стратамі

і расчараваннямі ў сваіх блуканнях па свеце даходзяць да восені жыцця. П. Васючэнка піша, што даследчыкі вельмі ўхвальна паставіліся да апавядання М. Стральцова «Смаленне вепрука»: «Крытыкі, якія стварылі культ гэтага апавядання, высока ацэньвалі ў творы ўсё: ад дасціпнай задумы да стылю, віртуознасць якога дазволі аўтару спаборнічаць з маладым Кузьмой Чорным і нават з Іванам Буніным» [1, с. 414]. Гэта апавяданне стала апошнім ў творчай спадчыне Стральцова-празаіка, далей пісьменнік піша пераважна вершы. Прааналізаваўшы першае і фактычна апошняе апавяданне М. Стральцова, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што пісьменнік – тонкі знаўца чалавечай душы, яе ўнутраных ваганняў, перажыванняў і несумненна пошукаў свайго месца сярод людзей.

М. Танк казаў, што М. Багдановіч пісаў адразу выбранае. Смела можна сцвярджаць, што і М. Стральцоў, як і яго ўлюбёны паэт Максім Багдановіч, пісаў адразу выбранае. Кожны твор пісьменніка цэласны, самадастатковы, глыбінны, з тонкім пачуццём філалагічнага густу. М. Стральцоў заўчасна пакінуў гэты свет, але яго лірычны герой заўсёды з намі. Магчыма, у вобразе лірычнага героя сам М. Стральцоў прыходзіць да нас, каб пагрэцца каля агню чалавечых сэрцаў, вяртаецца на сваё месца ў грамадстве.

Такім чынам, вытокі маральна-этычных пошукаў герояў апавяданняў М. Стральцова ляжаць у дзяцінстве, там лірычны герой пачуваецца надзвычай спакойна, лёгка. Пісьменнік у апавяданні «Роздум» піша: «Трывожна і боязна бывае на душы – чамусьці ўсё часцей успамінаецца маленства. Чаму, навошта? І чаму іменна цяпер? І так хораша, жыва паўстаюць у памяці ранейшыя радасць і смутак, і так шкада, як падумаеш, што не вернеш ужо назад ні такой, як тады, радасці, ні такога смутку. А яны ж так трэба цяпер мне: навошта мне, каб радасць, пасталеўшы, стала ціхамірнасцю, а смутак – журбой?» [2, с. 253]. Чалавек сталее і абрастае праблемамі, абавязкамі, страхамі. Яго пошукі суправаджаюцца, дзякуючы жыццёвым клопатам і хваляванням, страхамі. Доўгачаканая ў дзяцінстве сталасць апынаецца не такой шчаслівай, як падавалася. М. Стральцоў піша: «І так трывожна і боязна бывае на душы – няўжо так пачынаецца сталасць?» [2, с. 253]. З надыходам дарослага жыцця ўсё часцей узгадваецца дзяцінства: «Было ж і раней у мяне маленства, і раней успамінаў аб ім, але ж мне было так добра з ім, як добра рэчцы ў берагах, а дрэвам у голлі. Дык навошта ж рэчка выходзіць з берагоў і пасля па іх сумуе? Навошта дрэва высока ўгору выносіць свае шаты, навошта сумуе па грыбных зацішках роснай зямлі? » [2, с. 253]. У канцы пісьменнік зліваецца са сваім лірычным героем, які прамаўляе: «Можа, так і са мной: і шкада, шкада ўжо маленства, і трывожна, боязна за маладую сталасць» [2, с. 253].

М. Стральцоў пісьменнік глыбока лірычны. А. Адамовіч піша пра М. Стральцова: «А на пачатку быў – калі браць не проста тэму, а ўзровень мастацкай думкі – ён, Міхась Стральцоў…» [4, с. 7]. Мастак слова вядзе дыялог са сваім чытачом на мове шляхетнай, якая сама па сабе ўжо з'яўляецца творам мастацтва. Слушна заўважыў А. Сідарэвіч: «Пісанне – гэта тое, што называюць працаю душы. А пра гэтую працу ўголас не скажаш, не распавядзеш. Пра яе мы даведваемся, чытаючы радкі, прасякаючыся настроем аўтара, настройваючыся на лад ягоных думак, пачуццяў. Так адбываецца дыялог пісьменніка і чытача. Мажліва, самы інтымны, прадуктыўны дыялог» [3, с. 11]. Лірычны герой прозы М. Стральцова – глыбокі філосаф тонкага імпрэсіяністычнага светаадчування, здольны да суперажывання і духоўнага самаўдасканалення.

*Літаратура*

1. *Васючэнка, П. В.* Міхась Стральцоў / П. В. Васючэнка // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. : у 4 т. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – Т. 4. Кн. 2. 1986–2000. – С. 404–425.
2. *Стральцоў, М. Л.* Выбраныя творы / М. Л. Стральцоў ; уклад і камент. Міхася Скоблы. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – 652 с.
3. *Сідарэвіч, А. М.* Міхась Стральцоў / Выбраныя творы / М. Л. Стральцоў ; уклад і камент. Міхася Скоблы. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – 652 с.
4. *Адамовіч, А.* Міхась Стральцоў – учора і заўтра / А. Адамовіч // Стральцоў М. Выбранае: Проза, паэзія, эсэ. – Мінск : Маст. літ, 1987. – С. 3–8.
5. *Колас, Я.* Сымон-музыка: паэма: для сярэд. і ст. шк. узросту / Я. Колас; маст. М. М. Селяшчук. – Мінск : Юнацтва, 1989. – 270 с.

*References*

1. *Vasyuchenka, P. V.* Mikhas Straltsou / P. V. Vasyuchenka // Gistoryya belaruskay litaratury XX st.: u 4 t. – Minsk : Belarus. navuka, 2003. – T. 4. Kn. 2. 1986–2000. – S. 404-425.
2. *Straltsou, M. L.* Vybranyya tvory / M. L. Straltsou ; uklad i kament. Mikhasya Skobly. – Minsk : Belarus. navuka, 2015. – 652 s.
3. *Sidarevich, A. M.* Mikhas Straltsou / Vybranyya tvory / M. L. Straltsou ; uklad i kament. Mikhasya Skobly. – Minsk : Belarus. navuka, 2015. – 652 s.
4. *Adamovich, A.* Mikhas Straltsou – uchora i zautra / A. Adamovich // Straltsou M. Vybranaye: Proza, paeziya, ese. – Minsk : Mast. lit., 1987. – S. 3-8.
5. *Kolas, Ya.* Symon-muzyka: paema: dlya syared. i st. shk. uzrostu / Ya. Kolas; mast. M. M. Selyashchuk. – Minsk : Yunatstva, 1989. – 270 s.